# ПРАДМЕТ І ЗАДАЧЫ НАВУЧАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

Панятоўская Лізавета Дзмітрыеўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Методыка навучання беларускай мовы як навука з’яўляецца галіной педагагічнай навукі. Існуе , аднак, меркаванне, што методыка навучання беларускай мове ёсць міждысцыплінарная галіна ведаў, звязаная з лінгвістыкай, літаратуразнаўствам, псіхалогіяй і інш. Такі падыход адмаўляе методыку як самастойную тэарэтычную навуку. Часам методыцы навучання беларускай мове адводзяць ролю прыкладной дысцыпліны, якая грунтуецца на выкарыстанні ведаў, запазычаных з іншых навук. Як і ў першым выпадку, методыцы адмаўляюць у праве мець свой прадмет, ён падмяняецца сукупнасцю палажэнняў, узятых з розных навуковых галін. Пытанне навучання беларускай мове, такім чынам, не разглядаецца як самастойны напрамак, цэласная сістэма.

Услед за М.Р. Львовым многія спецыялісты разглядаюць методыку навучання як самастойную дысцыпліну, асноўнымі прыкметамі якой з’яўляюцца: 1) ўласныя прадмет даследавання і паняційны апарат; 2) уласцівыя дадзенаму прадмету заканамернасці; 3) спецыфічныя задачы даследавання; 4) уласныя метады даследавання.

Прадметам методыкі навучання беларускай мове з’яўляюцца сутнасць, заканамернасці, тэндэнцыі і перспектывы навучання малодшых школьнікаў беларускай мове. Сутнасць навучання беларускай мове раскрываецца ва ўзаемадзеянні настаўніка і вучня пры рэалізацыі суб’ектна-аб’ектнай мадэлі навучання. Гэта ўзаемадзеянне можа мець розную накіраванасць, працякаць у розных формах. Пры гэтым настаўнік як суб’ект заўсёды арганізуе дзейнасць вучня як аб’екта, кіруе фарміраваннем гэтай дзейнасці. У сваю чаргу, арганізацыя і кіраванне з боку настаўніка вызначаюць характар дзейнасці вучня з пункту гледжання яго актыўнасці, самастойнасці, матываванасці, праяўлення цікавасці да дадзенай дзейнасці і інш. Выкаванне патрабаванняў дзяржаўнага адукацыйнага стандарта рэалізацыі дзейнаснага і кампетэнтнаснага падыходаў залежа перш за ўсё ад дыдактычнай накіраванасці дзейнасці настаўніка і менш за ўсё ад якіх-небудзь іншых знешніх фактараў. Як і ва ўсе часы, настаўнік у працэсе навучання застаецца цэнтральнай фігурай, ад яго намаганняў залежаць вынікі навучання. Тут можна было б запярэчыць: «А як жа навучанне з дапамогай розных мультымедыйных праграм?» І ў гэтым выпадку настаўнік нябачна прысутнічае  пры арганізацыі дзейнасці вучня, кіруе ёй, складае праграмы, тэксты і інш.

Агульныя заканамернасці навучання беларускай мове выяўляюць істотныя сувязі і адносіны паміж зместам, умовамі навучання і яго вынікамі. Методыка бачыць працэс навучання як сукупнасць прычынна-абумоўленых працэсаў, ахоплівае заканамернасці. Напрыклад, у змесце навучання адбор ведаў і пабудова логікі іх падачы шмат у чым вызначаюць, якая карціна свету будзе намаляваная ў свядомасці школьніка, якое каштоўнаснае стаўленне да свету будзе выхавана. Перадача ведаў вучням у гатовым выглядзе пры выкарастанні рэпрадуктыўных метадаў навучання, што характэрна для «школы зубрылкі», часцей за ўсё вядзе да фарміравання рэпрадуктыўных відаў дзейнасці, выхоўвае асобу як выканаўцу з нізкай ступенню актыўнасці і самастойнасці. Характарызуючы методыку навучання беларускай мове як навуку, варта таксама адзначыць, што да нядаўняга часу яна была эмпірычнай, у ёй слаба выкарыстоваўся матэматычны апарат, хоць вядома, што навука набывае дакладнасць, строгасць, статус навукі «моцнай версіі» толькі пры выкарастанні ў ёй сродкаў матэматыкі. Таму ў цяперашні час матэматызацыя методыкі навучання беларускай мове з’яўляецца вядучай тэндэнцыяй яе развіцця, што пазбаўляе ад аднабокавага апісання педагагічных фактаў без глыбокага пранікнення ў іх сутнасць. Доўгі час методыка навучання беларускай мове засноўвалася на аналізе педагагічнага вопыту – раздзяленні цэласнага навучальнага працэсу на часткі. У цяперашні час дзякуючы больш шырокаму вькарыстанню структурнага метада і метада мадэлявання стаў часцей прымяняцца сінтэтычны падыход, пры якім навучанне малодшых школьнікаў беларускай мове мысліцца як цэлае, як сістэма, што дазваляе намеціць шляхі павышэння якасці навучання малодшых школьнікаў беларускай мове.

Задачы методыкі навучання беларускай мове вылучаюцца зыходзячы з прадмета навукі.

1. Вызначэнне мэт і задач навучання беларускай мове малодшых школьнікаў з улікам патрабаванняў асобы, сям’і, грамадства, дзяржавы, што адлюстравана у матэрыялах дзяржаўнага адукацыйнага стандарту пачатковай агульнай адукацыі.

2. Вызначэнне прынцыпаў адбору навучальнага матэрыялу, адпрацоўка зместу навучання (навучальных планаў, праграм, падручнікаў, камп’ютарных праграм і г. д.). Дадзеная праца ажыццяўляецца пры ўмове рэалізацыі агульнадыдактычных прынцыпаў навучання (даступнасці, сувязі з жыццём, апоры на актуальныя інтарэсы вучня, нагляднасці).

3. Стварэнне педагагічных тэхналогій засваення ведаў вучнямі пачатковай школы па беларускай мове на аснове вывучэння заканамернасцей, працэсу навучання, рацыянальнага выбару метадаў навучання пры фарміраванні вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў,

рэалізацыі гэтых метадаў праз эфектыўныя спосабы навучання (сукупнасць прыёмаў, сродкаў і формаў навучання). У аснове тэхналогій навучання ляжыць сістэмна-дзейнасны падыход, які забяспечвае фарміраванне гатоўнасці асобы да самаразвіцця і бесперапыннай адукацыі, актыўную вучэбна-пазнавальную дзейнасць школьнікаў і г.д. Разам са зместам навучання яго тэхналогіі рэалізуюць патрабаванні да вынікаў засваення адукацыйнай праграмы пачатковай агульнай адукацыі – асобасных, метапрадметных, прадметных. Галоўным тут становіцца пошук новых формаў і сродкаў навучання пры рэалізацыі тых магчымасцяў, якія дае пачатковай школе сучасны навуковы прагрэс.

4. Распрацоўка сістэмы рознаўзроўневых самастойных работ па беларускай мове з улікам характару рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай дзейнасці, а таксама ўзроўняў ведаў вучняў пачатковай школы, што дазваляе вызначаць траекторыю ідывідуальнага развіцця малодшых школьнікаў, ажыццяўляць падыходы ідывідуалізацыі і дыферэнцыяцыі навучання.

5. Распрацоўка сістэмы кантролю ходу і вынікаў навучання малодшых школьнікаў беларускай мове. У цяперашні час увага да праблемы кантролю ўзмацнілася, так як арганізацыя эфектыўнага навучання немагчыма без рэалізацыі навукова абгрунтаваных стандартызаваных працэдур кантролю за ходам і вынікамі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці школьнікаў. Сучасны настаўнік павінен валодаць наступнымі ўменнямі адназначна вызначаць, што і як павінен засвойваць вучань на кожным узроўні дзейнасці ў рамках кожнай кантраляванай тэмы; ужываць такія спосабы вымярэння засвоенага (псеўдатэсты, тэсты, тэставыя заданні, творчыя работы і інш.), якія дазваляюць у далейшым аб'ектыўна ацаніць пройдзенае.

Сучасныя навуковыя распрацоўкі ў галіне сістэмна-структурнай дыдактыкі дазваляюць ажыццяўляць кантроль ведаў школьнікаў, вькарыстоўваючы яго таксама як сродак актывізацыі вучэбнай пазнавальнай дзейнасці школьнікаў, актуалізацыі псіхалагічных механізмаў засваення ведаў, матывацыі малодшых школьнікаў на паспяховую вучэбна-пазнавальную дзейнасць.

6. Распрацоўка і рэалізацыя ўмоў інтэлектуальнага і эмацыйнага развіцця і выхавання школьнікаў, павышэння ўзроўню іх актыўнасці і самастойнасці, фарміравання станоўчай матывацыі ў навучанні.

У цэлым магістральнай задачай методыкі навучання беларускай мове ў сучаснай пачатковай школе становіцца кіраванне працэсам фарміравання вучэбнай пазнавальнай дзейнасці вучняў пры вывучэнні беларускай мовы ў рамках сучаснай мадэлі гуманнай асобасна-арыентаванай педагогікі.

Задачы метадычнай навукі напрамую звязаны з развіццём здольнасцяў малодшых школьнікаў да пазнавальнай творчай дзейнасці, духоўным і

маральным удасканаленнем пры засваенні імі найбагацейшага вопыту нацыянальнай культуры, выпрацаванага на працягу тысячагоддзяў, выяўленага ў формах мовы, маўлення. Паспяховае вырашэнне сучаснай методыкай дадзеных задач напрамую звязана з інтарэсамі развіцця як асобы вучня, так і беларускага грамадства ў цэлым.